# Абмяркоўвалі вучоныя–эканамісты

Як паведамлялі ўжо, з 27 па 29 верасня ў нашым універсітэце праходзіла ўсесаюзная нарада вучоных-эканамістаў. На іх пасяджэнні было заслухана і абмеркавана шэраг дакладаў па тэме: «Структурныя зрухі ў прамысловасці СССР ва ўмовах сучаснай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі». Выступалі вучоныя з розных рэспублік і абласцей краіны.

29 верасня было праведзена арганізацыйнае пасяджэнне камісіі па эканамічнай гісторыі секцыі палітычнай эканоміі навукова-тэхнічнага Савета Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, на якім прысутнічалі сакратар абкома КПБ М. І. Жыльскі і рэктар нашага ўніверсітэта доктар фізіка-матэматычных навук Б. В. Бокуць.

Ад імя ўдзельнікаў нарады старшыня аргкамітэта прафесар І. М. Шамякін выказаў вялікую ўдзячнасць рэктару ўніверсітэта Б. В. Бокуцю, прарэктару па завочнаму аддзяленню Т. П. Трацэўскай за выдатную арганізацыю работы нарады і тыя спрыяльныя ўмовы, якія былі створаны для работы камісіі па эканамічнай гісторыі.

На арганізацыйным пасяджэнні камісіі прафесар І. М. Шамякін падвёў вынікі работы вучоных-эканамістаў краіны, падкрэсліў вялікую значнасць зробленых дакладаў і выступленняў.

На заключным пасяджэнні камісіі быў разгледжан і зацверджан план яе работы на кастрычнік-снежань 1973 года. Перад прысутнымі выступіла загадчыца рэдакцыі «Эканоміка» выдавецтва «Вышэйшая школа» В. А. Макарава. Яна гаварыла аб запланаваных выданнях, аб выпуску стабільнага падручніка па эканоміцы СССР. Дамоўлена таксама аб выданні асобнай кніжкай дакладаў і выступленняў вучоных, зробленых на пасяджэнні камісіі ў Гомельскім дзяржуніверсітэце.



НА ЗДЫМКУ: на заключным пасяджэнні.
Фота А. Рудчанкі.

## НАШЫ ІНТЭРВ'Ю



**З прафесарам А. А. Успенскім (г. Масква)**

□

— Наша работа праходзіла чотка і на высокім арганізацыйным узроўні. Разгледжан шэраг важных пытанняў па эканоміцы, палітэканоміі, народнагаспадарчаму планаванню. Шырокае асвятленне атрымала праблема навуковых асноў міжнароднай і сацыялістычнай інтэграцыі. Вялікую цікавасць выклікалі змястоўныя даклады аб эканамічным развіцці савецкіх рэспублік і нашай краіны ў цэлым.

Хоць я жыву і працую ў Маскве, але ваш Гомель для мяне таксама вельмі блізкі. Трыццаць гадоў таму назад я ўдзельнічаў у яго вызваленні ад нямецка - фашысцкіх захопнікаў. Тады Гомель ляжаў у руінах і папялішчах. А цяпер проста не верыцца, што так хутка ён аднавіўся, разросся, намнога папрыгажэў. Гэта — красамоўнае сведчанне нашых вялікіх магчымасцей, працоўнага гераізму савецкіх людзей, каласальнага эканамічнага патэнцыялу СССР.

**З прафесарам, старшынёй аргкамітэта І. М. Шамякіным (г. Масква).**

□

— Выязднbackground пасяджэнні камісіі па эканамічнай гісторыі секцыі палітычнай эканоміі навукова-тэхнічнага Савета Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР сталі традыцыйнымі. Яны садзейнічаюць умацаванню кантактаў з вучонымі - эканамістамі саюзных рэспублік і абласцей нашай краіны.

Для правядзення пасяджэння камісіі ў сёлетнім годзе горад Гомель быў выбран невыпадкова. Ён, з адкрыццём універсітэта, пераўтвараецца ў адзін з значных навуковых цэнтраў.

Мы спадзяваліся, што наша работа тут будзе праходзіць паспяхова. Тая гасціннасць, якую аказалі нам на палескай зямлі, уважлівасць і чуласць, нарэшце, выдатная арганізацыя нашых пасяджэнняў пераўзышлі ўсе нашы чаканні.

Асабіста і ад імя ўдзельнікаў нарады выношу за гэта шчырую ўдзячнасць.





**З прафесарам М. Р. Рускулбекавым (Кіргізская ССР)**

□

— Я ў Гомелі ўпершыню. Сваімі вачыма ўбачыў сучасны прыгожы, зялёны горад. Але для мяне вядома, якія велізарныя разбурэнні ўчынілі тут у гады Вялікай Айчыннай вайны нямецка - фашысцкія захопнікі. Таму, знаёмячыся з Гомелем, з вашым універсітэтам, пераконваешся, якімі хуткімі тэмпамі ў пасляваенны перыяд ішло аднаўленне народнай гаспадаркі і сістэмы вышэйшай адукацыі.

У вашым універсітэце мне спадабаліся добра абсталяваныя кабінеты, а галоўнае — выдатныя людзі. На кафедры палітычнай эканоміі працуе з'яднаны і высокакваліфікаваны калектыў, у якога можна многаму павучыцца. З кабінета палітычнай эканоміі я запазычыў асобныя планы, схемы.

Хоць наш Кіргізкі ўніверсітэт знаходзіцца ад вашага на вялікай адлегласці, але гэта не з'явіцца перашкодай для ўмацавання нашых сувязей.

**З выкладчыцай Латвійскага ўніверсітэта Ф. Х. Александзер.**

□

— Перш за ўсё мне таксама хочацца сказаць некалькі слоў пра ваш горад. Адчуваецца, што тут вельмі многа клапоцяцца аб добраўпарадкаванні, вялікая ўвага звяртаецца ўніверсітэту. Бясспрэчна, ён стаў вядучай вышэйшай навучальнай установай беларускага Палесся. Не даводзіцца сумнявацца ў яго вялікай перспектыве.

Мы з цікавасцю знаёміліся з вашым старажытным і разам з тым маладым і з кожным годам прыгажэючым горадам. Ахвотна наведалі краязнаўчы музей, дзе азнаёміліся з гераічным мінулым Гомельшчыны.

Ужо многа сказана пра гасціннасць, выключную арганізаванасць і сяброўскую атмасферу, якая панавала ў час пасяджэнняў камісіі і азнаямлення з горадам і ўніверсітэтам. Я не буду паўтарацца. Далучаюся да выказанай падзякі.



□

**На нарадзе вучоныя шырока абменьваліся думкамі па ўсіх пытаннях выкладання і развіцця эканамічнай навукі. Шчырая размова працягвалася і пасля пасяджэнняў.**

□



**З прафесарам У. Г. Сарычавым (г. Ленінград)**

□

— На беларускай зямлі я ў другі раз. Прыязджаю сюды з вялікай ахвотай. Скажу без перабольшвання: і ваш універсітэт, і Гомель мне вельмі спадабаліся. У вас цудоўны цырк, шмат зеляніны. Словам, горад вельмі прыгожы.

Што датычыцца нашых навуковых пасяджэнняў, то яны праходзілі арганізавана, даволі цікава і з'явіліся для ўсіх нас вельмі карыснымі.

Прыемнае ўражанне засталося ў мяне ад азнаямлення з работай кафедры палітычнай эканомікі, кабінетам палітэканоміі. Тут шмат нагляддных дапаможнікаў, навуковых і метадычных распрацовак. На высокім узроўні знаходзіцца навуковая работа.

Я з задавальненнем пераймаў вопыт калег з Гомельскага ўніверсітэта. Самае патрэбнае з іх багажа забіраю з сабою. Думаю, што ёсць сэнс развіваць і ўмацоўваць сяброўскія сувязі з вучонымі - эканамістамі вашага ўніверсітэта.



# ЗА ЭФЕКТЫЎНЫЯ СРОДКІ ВЫХАВАННЯ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Ва ўніверсітэце рэгулярна праводзіліся экскурсіі па месцах рэвалюцыйнай і баявой славы савецкага народа, звязаных з гераічным мінулым нашай дзяржавы. За мінулы навучальны год каля 1200 студэнтаў універсітэта зрабілі экскурсіі ў Маскву, Ленінград, Кіеў, Мінск, Брэст, Валгаград, да Кургана Славы і ў іншыя славутыя мясціны.

Нашы студэнты наладзілі цесныя сувязі з воінскай часцю гарнізона г. Гомеля. Воіны неаднаразова выступалі з канцэртамі перад калектывам ГДУ, а выхаванцы ўніверсітэта — перад армейскай аўдыторыяй.

Паявіліся цікавыя формы інтэрнацыянальнага выхавання моладзі. Умацоўваюцца сяброўскія сувязі ўніверсітэта з вну брацкіх сацыялістычных краін. У нашым універсітэце летась выступаў дацэнт Сафійскага ўніверсітэта Гнуем Станчавіч Манафаў, а сёлета — член ЦК Румынскай камуністычнай партыі Карнэл Юга. Пачынаючы з 1972 года, стала традыцыяй абменьвацца студэнцкімі будаўнічымі атрадамі з вышэйшай Сельскагаспадарчай школай г. Чэске-Будэйовіцэ Паўднёва-Чэшскай вобласці Чэхаславакіі. На працягу доўгага часу мы абменьваемся дэлегацыямі студэнтаў з Ягелонскім універсітэтам Польшчы.

У ходзе ажыццяўлення складаных вучэбных і палітыка-выхаваўчых задач перад партыйнай арганізацыяй вну стаяць многія нявырашаныя або мала вырашаныя праблемы. Мы павінны дабіцца таго, каб ні адзін наш студэнт, няхай гэта стацыянарнік ці завочнік, не быў аблытаны путамі рэлігійных забабонаў, быў глыбока пераканаым марксістам-ленінцам.

У ходзе камуністычнага будаўніцтва ўзрастае роля навукова-тэхнічнага прагрэсу. Сярод частскі студэнтаў назіраюцца элементы абсалютызацыі прыродазнаўчых і тэхнічных навук, недаацэнкі ролі ідэалогіі ў забеспячэнні стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму. Партыйная арганізацыя, кафедры грамадскіх навук, рэктарат імкнуцца да таго, каб у ходзе навучальнага працэсу больш увагі ўдзялялася **метадалагічным асновам тэхнічных і прыродазнаўчых навук**, скарачаўся наяўны разрыў паміж грамадскімі і прыродазнаўчымі навукамі. Кафедры грамадскіх навук павінны ў большай ступені ўздзейнічаць на ідэйна-тэарэтычны ўзровень лекцый па спецыяльных дысцыплінах, чым гэта робіцца цяпер. Гэта павінна адлюстроўвацца ў больш цесных кантактах кафедр пры абмеркаванні праблем метадалагічнага характару ў сістэме партыйнай вучобы, наведванні актывістамі ўводных і іншых лекцый па спецыяльных дысцыплінах.

Далейшае павышэнне эфектыўнасці выкладання грамадскіх навук патрабуе ўдасканальвання методыкі выкладання іх на базе шырокіх **сацыялагічных даследаванняў** па праблемах адзінства светапогляду, маральнасці і паводзін студэнта, маладога спецыяліста. Адзнака эфектыўнасці выкладання грамадскіх навук павінна вымярацца не толькі працэнтам паспяховасці, але і ўдзелам студэнтаў ва ўсіх відах грамадскай работы, паказчыкамі працоўнага семестра, памяньшэннем колькасці амаральных учынкаў і г. д. Удасканальванне методыкі выкладання і вывучэння эфектыўнасці грамадскіх навук павінна праходзіць з прыцягненнем студэнцкага актыву да абмеркавання на кафедрах пытанняў методыкі вывучэння марксісцка-ленінскай тэорыі, арганізацыяй сустрэч выкладчыкаў з выпускнікамі вну, якія ўжо ў практычнай дзейнасці выкарыстоўваюць свой ідэйна-тэарэтычны багаж.

Улічваючы значную розніцу ў сістэме ўніверсітэцкага і школьнага выкладання, розныя метады палітыка-выхаваўчай работы ў школе і вну, нам варта больш увагі, чым гэта робіцца цяпер,

(Заканчэнне на 3-ай стар.)

МЕРЫДЫЯНЫ СТУДЭНЦКІХ, БУДАЎНІЧЫХ

# НА МАЛДАЎСКАЙ ЗЯМЛІ

**Сёлета ўпершыню ў нашым універсітэце былі сфарміраваны два студэнцкія будаўнічыя атрады з дзяўчат, якія выязджалі на сельскагаспадарчыя работы ў братнюю Малдавію. Пра працу на зямлі сонечнай рэспублікі, пра ўсе карысныя справы атрада «Гамяльчанка» і дні незабыўных сустрэч расказваецца ў гэтым матэрыяле.**

Студэнцкі атрад «Гамяльчанка» налічваў 46 байцоў. Гэта быў дружны, добра падабраны і падрыхтаваны да працы калектыў. У тым, што дзяўчаты эканамічнага факультэта з гонарам апраўдаюць званне байца СБА, можна было не сумнявацца яшчэ ў падрыхтоўчы перыяд. Аб гэтым сведчыла і вялікае жаданне працаваць у студэнцкім будаўнічым атрадзе і тое, з якім захапленнем і цікавасцю рыхтаваліся да летняга семестра агітбрыгада, лектарская група, рэдкалегія насценнага друку.

З сардэчнай цеплынёй сустрэлі нас на зямлі сонечнай Малдовы. Мітынг, прывітальныя прамовы, сустрэчы з кіраўнікамі калгасаў і саўгасаў... А потым — праца на палетках.

Чацвёртая брыгада саўгаса «Малдавія», куды накіравалі наш атрад, займалася вырошчваннем гародніны: цыбулі, морквы, капусты, гуркоў, памідораў, кабачкоў і г. д. Сталі і мы засвойваць прафесію гароднінаводаў. Праполка і ўборка ўраджаю гародніны былі асноўнымі нашымі работамі. Спачатку для многіх гэта аказалася нялёгкай справай. Балелі рукі, з непрывычкі ныла спіна. І штодрае сонца не заўсёды было нашым сябрам. Устаноўленыя нормы выпрацоўкі адразу здаваліся для нас недасягальнымі.

Але дзяўчаты не разгубіліся. З першага дня яны пачалі працаваць з вялікім стараннем. І хутка лічба 150 стала сярэднім працэнтам выканання штодзённых заданняў. А Ніна Мацюшэнка, Зоя Дзяркач, Антаніна Патапкова, Яўгенія Мяфёд, Кацярына Кучынская, Лярыса Жулега, Галіна Коўзік, Тамара Дарашкова і іншыя дзяўчаты выконвалі нават па дзве і больш норм. Наш дэвіз: «У кожнай вёсцы, у кожным горадзе — ударная камсамольская справа!» — не застаўся пустымі словамі.

У тым, што мы дасягнулі высокай выпрацоўкі, — вынік дзейснага сацыялістычнага спаборніцтва. Яно разгарнулася паміж усімі 13 атрадамі, якія працавалі ў саўгасе «Малдавія». Кожны з іх змагаўся за права называцца лепшым. Вынікі спаборніцтва падводзіліся кожны тыдзень. Мы неадназоава займалі прызавыя месцы. За ўдарную працу нас прэміравалі, арганізоўвалі паездкі ў Адэсу, на мора, у Кішынёў, узнагароджвалі граматамі.

Нашы дзяўчаты і спаборнічалі паміж сабой. Вынікі сацыялістычнага спаборніцтва падводзіліся штодзённа на ранічнай лінейцы і заносіліся ў табель «Наша спаборніцтва». Праца атрада шырока адлюстроўвалася таксама ў «баявых лістках», «маланках», у насценнай газеце «А ну, дзяўчаты!».

Брыгада, якая выходзіла пераможцам, узнагароджвалася пераходным вымпелам «Перадавіку сацыялістычнага спаборніцтва». Большасць ён знаходзіўся ў дзяўчат, якія працавалі пад кіраўніцтвам Антаніны Патапковай. Выдатна працавалі таксама бры гады Людмілы Дубінскай і Валянціны Скурловай. Асабліва старанна працавалі дзяўчаты ва ўдарныя дні: у фонд салідарнасці, у фонд будаўніцтва Палаца піянераў і школьнікаў горада Гагарына ,у фонд 50-годдзя камсамола Малдавіі.

І вось канчатковы вынік: мы ўбралі больш палавіны гародніны, якую адгрузіла брыгада № 4 на прыёмныя пункты перапрацоўчых прадпрыемстваў. А рэалізавана яе нямала: больш як на 52 тысячы рублёў.

Байцы «Гамяльчанкі» былі заняты не толькі працай у полі. Мы ўмелі з цікавасцю правесці і свой адпачынак. Актыўна выступала наша лектарская група. З цікавасцю слухаліся лекцыі і палітінфармацыі, падрыхтаваныя Галінай Коўзік, Людмілай Перапяліца, Валянцінай Цімашэнка, Любай Халфіной Вялікай папулярнасцю карыстаўся насценны друк, які выпускаўся пад кіраўніцтвам Ніны Мацюшэнка.

Шмат прыемных мінут даставілі вечары, прысвечаныя адкрыццю лагера, дню студэнцкіх будаўнічых атрадаў, а таксама карнавал. Не забыць і вечары адпачынку, разнастайныя спартыўныя спаборніцтвы, якія праводзіліся сумесна з байцамі атрада «Прыпяць» з Мазыра і моладдзю вёскі Копанка. Памятным будзе і рэспубліканскі фестываль «Лета-73» студэнцкіх будаўнічых атрадаў, які праводзіўся ў горадзе Слабадзея.

Вельмі хутка праляцелі дні. Наступіў развітальны вечар. Апошні раз гучаць нашы песні над Днястром. Словы ўдзячнасці, прэміі, граматы... Але самай дарагой узнагародай былі сціплыя словы брыгадзіра чацвёртай вытворчай брыгады саўгаса Івана Андрэевіча Замоты: «Вялікае вам дзякуй, дзяўчаты!»

**Л. РАМАНОВІЧ, камісар атрада «Гамяльчанка», студэнтка трэцяга курса эканамічнага факультэта.**

# ЗАХОЎВАЦЬ І ВЫВУЧАЦЬ ПОМНІКІ ГІСТОРЫІ

«...Сівая старажытнасць пры ўсіх абставінах застаецца для ўсіх будучых пакаленняў незвычайна цікавай эпохай»... Гэтыя словы належаць Ф. Энгельсу.

Сапраўды, сівое мінулае прываблівае сваёй нязведанасцю, таямнічасцю. Але чым глыбей мы апускаемся па лесвіцы стагоддзяў, тым усё менш і менш сустракаюцца пісьмовыя крыніцы, якія б маглі расказаць нам пра тыя далёкія часы. Таму выключнае значэнне атрымліваюць археалагічныя крыніцы: рыдлёўка і пэндзаль археолага раскажуць пра тое, аб чым не напісала пяро летапісца. Курганы, гарадзішчы, селішчы, стаянкі нашых далёкіх продкаў уяўляюць вялікую каштоўнасць для навукі. Спецыяльнай пастановай Савета Міністраў СССР яны ўзяты пад ахову дзяржавы. Раскопваць іх (у прыватнасці, на тэрыторыі Беларусі) без дазволу Акадэміі навук БССР катэгарычна забаронена.

На жаль, бываюць яшчэ выпадкі самавольных раскопак. Здараецца і так, што каштоўныя помнікі старажытнасці разоараюць пад пасевы або бяруць на гэтых месцах пясок для будаўнічых мэт. Так адбываецца таму, што насельніцтва не заўсёды ведае, што непазнаныя на першы погляд курган або гарадзішча — гэта не проста насып з зямлі, а своеасаблівы архіў, навуковае даследаванне якога можа дапамагчы прачытаць яшчэ адну старонку старажытнай гісторыі нашай Радзімы.

Для работы па ахове і прапагандзе помнікаў гісторыі СССР створана спецыяльнае таварыства. Секцыя гэтага таварыства ёсць і ў нашым універсітэце. Узначальвае яе дацэнт, кандыдат гістарычных навук П. Д. Верашчагін. Члены секцыі робяць многае па распаўсюджванню гістарычных ведаў, знаёмству студэнтаў з цікавымі выданнямі, дамагаюцца росту радоў таварыства.

Удзельнічаць у ахове помнікаў гісторыі і культуры — значыць уносіць свой пасільны ўклад у пачэсную справу зберажэння і вывучэння таго каштоўнага і прыгожага, што пакінулі нам былыя пакаленні.

Формы прапаганды помнікаў гісторыі — разнастайныя. Можна выступіць перад шырокай аўдыторыяй з лекцыяй або падрыхтаваць рэферат, выступіць з цікавым артыкулам у газеце. Кожнаму члену таварыства неабходна ведаць кнігу «Археалагічная карта Беларусі». Першы яе выпуск прысвечаны помнікам каменнага веку (аўтар — Г. В. Ісаенка), другі выпуск — помнікам жалезнага веку і перыяду Кіеўскай Русі (аўтар — Г. В. Штыхаў). У названай кнізе прыведзены перапік помнікаў у алфавітным парадку па абласцях, а ўнутры іх — па раёнах.

У Гомельскай вобласці ўзята на ўлік 509 населеных пунктаў, каля якіх ёсць курганы, гарадзішчы або селішчы. Лічба вялікая, але няпоўная. Вучоным ведомы яшчэ не ўсе помнікі. Тут для членаў таварыства па ахове помнікаў гісторыі і культуры — шырокае поле дзейнасці. Яны павінны аказаць значную паслугу навуцы ў выяўленні новых помнікаў, удакладненні аб іх звестак, у апісанні вядомых сведак старыны.

**Ул. БАГАМОЛЬНІКАЎ, студэнт 5-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# НА СТАРЦЕ—ПЯТАЯ ЎНІВЕРСІТЭЦКАЯ

(Працяг. Пачатак №№ 26, 27)

**УЗНАГАРОДЖАННЕ:**

Факультэт, які зойме першае месца, узнагароджваецца пераходным кубкам, памятным вымпелам і граматай **спартклуба.**

Факультэты, якія зоймуць II і III месцы, узнагароджваюцца граматамі спартклуба.

Удзельнікі-прызёры спаборніцтваў узнагароджваюцца граматамі **спартклуба.**

Трэнеры спартсменаў, якія зоймуць першыя месцы і пакажуць вынікі не ніжэй І-га спартыўнага разрада, узнагароджваюцца граматамі спартклуба.

**ЗАЯЎКІ**

Заяўкі падаюцца ў судзейскую калегію ў дзень яе пасяджэння. Неафармленая і несвоечасова пададзеная заяўка разглядацца не будзе, а каманда не атрымае допуску да спаборніцтваў.

**БАСКЕТБОЛ, ВАЛЕЙБОЛ**

Састаў каманд — 12 чалавек.

Спаборніцтвы праводзяцца па кругавой сістэме ў адзін круг.

Залік: перамога — 2 ачкі, паражэнне — 0 ачкоў. Месца вызначаецца па найбольшай колькасці ачкоў. За дзве няяўкі каманда здымаецца са спаборніцтваў і яе вынікі анулююцца.

У камандны залік спартакіяды ідуць паасобна вынікі сярод жаночых і мужчынскіх каманд. У выпадку роўнай колькасці ачкоў у дзвюх каманд месца вызначаецца па выніку гульні паміж імі. У выніку аднолькавай колькасці ачкоў у трох і больш каманд месца вызначаецца: у баскетболе — па лепшай розніцы забітых і прапушчаных ачкоў у гульнях спрачаючыхся каманд, а ў выпадку і гэтай роўнасці — у гульнях паміж усімі камандамі; у валейболе — па лепшай розніцы выйграных партый у гульнях адпаведна вышэй сказанага.

**БАРАЦЬБА КЛАСІЧНАЯ**

Спаборніцтвы асабіста-камандныя. Састаў каманды неабмежаваны.

Камандны залік па 8 лепшых выніках незалежна ад вагавай катэгорыі па найбольшай колькасці ачкоў. За першае месца, занятае ўдзельнікам, каманда атрымлівае 10 ачкоў, за другое — 8, трэцяе — 6 і за кожнае наступнае — на ачко менш.

**ГІМНАСТЫКА СПАРТЫЎНАЯ**

Спаборніцтвы асабіста-камандныя.

Асабістыя месцы вызначаюцца па найбольшай суме балаў, набраных удзельнікам у кожным відзе і ў мнагабор'і. Састаў каманды: 3 мужчыны і 3 жанчыны.

Камандныя месцы вызначаюцца па найбольшай суме набраных ачкоў усімі ўдзельнікамі каманды.

У майстроў спорту па мнагабор'ю і па снарадах ачкі налічваюцца: за першае месца — 30, за кожнае наступнае — 2 ачкі менш; кандыдатам у майстры спорту: за першае месца — 26 ачкоў, за кожнае наступнае — на два менш; у спартсменаў першага разрада: за першае месца — 12 ачкоў, за кожнае наступнае — на ачко менш; у спартсменаў другога і трэцяга разрадаў: за першае месца — 6 ачкоў, за кожнае наступнае — на ачко менш.

Ачкі ў спартсменаў-разраднікаў налічваюцца поўнасцю пры выкананні разраднага нарматыва, а ў выпадку невыканання налічваецца толькі 50 працэнтаў ачкоў. У майстроў і кандыдатаў у майстры ачкі налічваюцца адпаведна пры выкананні 80 працэнтаў разраднага нарматыва.

(Заканчэнне на 4 стар.)

# ЗА ЭФЕКТЫЎНЫЯ СРОДКІ ВЫХАВАННЯ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й і 2-й стар.).**

**звярнуць на работу са студэнтамі малодшых, асабліва першых курсаў.** Школа ж павінна прывіць больш самастойнасці сваім выпускнікам.

Адной з важнейшых праблем, звязаных з эфектыўнасцю ідэалагічнай работы, з'яўляецца раўнамернае размеркаванне прадстаўніцтва ўсіх сацыяльных груп сярод студэнтаў адпаведна месцу гэтых груп у структуры грамадства. У прыватнасці, нам крайне важна павялічыць сярод студэнтаў праслойку рабочых і калгаснікаў, іх дзяцей. Гэтаму паспяхова садзейнічае падрыхтоўчае аддзяленне. Між тым неабходна ажыццявіць і шэраг іншых мер. У прыватнасці, варта ўмацоўваць сувязі ўніверсітэта з агульнаадукацыйнымі школамі. Станоўчы ў гэтым сэнсе вопыт цесных кантактаў эканамічнага, фізічнага, механіка-матэматычнага і іншых факультэтаў з сярэднімі школамі Гомельшчыны. Правядзенне фізічных і матэматычных алімпіяд і конкурсаў, работа матэматычнай школы, лінгвістычнага гуртка на грамадскіх пачатках пры універсітэце, арганізацыя факультэцкіх вечароў у школе вобласці — усё гэта дазволіла станоўча ўздзейнічаць на папяпшэнне якаснага саставу студэнтаў, павелічэнне прадстаўніцтва рабочых і калгаснікаў сярод студэнцкай моладзі. У 1973/1974 навучальным годзе ўдзельная вага дзяцей рабочых і калгаснікаў, малодых сельскіх працаўнікоў, якія сталі першакурснікамі ГДУ, склала 60 працэнтаў, прычым пражываючых непасрэдна ў сельскай мясцовасці — больш 30 працэнтаў.

Для ўзмацнення партыйнага ўздзеяння на студэнцтва неабходна далейшае павелічэнне партыйнай праслойкі сярод студэнтаў. З гэтай мэтай нам можна паўней выкарыстоўваць магчымасці прыёму ва ўніверсітэт членаў партыі праз падрыхтоўчае аддзяленне. Так, у 1972 годзе на падрыхтоўчае аддзяленне было прынята 23 камуністы. Сёлета з ліку студэнтаў 9 чалавек прынята кандыдатамі ў члены КПСС.

«Рашэнні XXIV з'езда КПСС як бы ўручаюць савецкай моладзі эстафету навукова-тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу», — гаварыў Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў на Усесаюзным злёце студэнтаў.

І наш абавязак: працаваць так, каб гэта эстафета была ў надзейных руках!

# НА СТАРЦЕ—ПЯТАЯ УНІВЕРСІТЭЦКАЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-яй стар.).

### ЛЕГКАЯ АТЛЕТЫКА

Спаборніцтвы асабіста-камандныя. Састаў каманды — 25 чалавек. У камандны залік уходзіць сума ачкоў 30 вынікаў, у тым ліку 2 эстафеты незалежна ад пола. Вынікі ўдзельнікаў ацэньваюцца па табліцы ачкоў 1962 года. Кожны ўдзельнік мае права выступаць у двух відах праграмы, не ўлічваючы эстафеты.

**Праграма:**

Мужчыны бег — 100, 200, 400, 800, 1500, 3000 м, эстафеты 4×100, 4×400 м, спартыўная хадзьба на 5 км, скачкі — у даўжыню, вышыню, трайным, бар'ерны бег на 110 і 200 м, штурханне ядра, кіданне молата, мятанне дыска і кап'я.

Жанчыны: бег — 100, 200, 400, 800, 1500 м, эстафеты 4×100, 4×200, скачкі ў даўжыню і вышыню, штурханне ядра, мятанне дыска і кап'я, бар'ерны бег на 100 м.

Мнагабор'е праводзіцца ў асабістым заліку.

### ЛЕГКААТЛЕТЫЧНЫ КРОС

Спаборніцтвы асабіста-камандныя. Састаў каманды — 40 чалавек. Залік — па 25 лепшых выніках незалежна ад пола і дыстанцыі. Каманднае месца вызначаецца па найменшай суме ачкоў-месц. У праграме: для мужчын — 1000 і 3000 м, для жанчын — 500 і 1000 м.

### ЛЫЖНЫ СПОРТ

Спаборніцтвы асабіста-камандныя, праходзяць у два туры.

Першы тур — снежань — эстафеты: мужчыны 4×5 і 4×10 км, жанчыны — 4×3 і 4×5 км.

Другі тур — сакавік — лыжныя гонкі: мужчыны — 10, 15 км, жанчыны — 3 і 5 км. Састаў каманды другога тура неабмежаваны. Залік — па 5-ці лепшых выніках на кожнай дыстанцыі. Каманднае месца вызначаецца па найбольшай суме набраных ачкоў (па табліцы ачкоў).

### ПЛАВАННЕ

Спаборніцтвы асабіста-камандныя. Састаў каманды неабмежаваны. Спаборніцтвы праходзяць у два этапы.

**Праграма:**

Першы этап — снежань — 100 м в/с, 100 м брас, 100 м на спіне, эстафета 4×50 м. Залік па двух лепшых выніках на кожнай дыстанцыі і па эстафеце.

Другі этап — сакавік: в/с — 100, 200 і 400 м, брас — 100 і 200 м, на спіне — 100 і 200 м, дзельфін — 100 м, эстафеты — 4×100 вольным стылем і 4×50 м — камбінаваным.

Залік — па 10 лепшых выніках, незалежна ад дыстанцый і пола і эстафетах.

Кожны ўдзельнік мае права выступіць не больш чым у двух відах праграмы, не лічачы эстафет.

Асабістыя месцы вызначаюцца па лепшаму выніку. Агульнакамандныя месцы вызначаюцца па найбольшай суме ачкоў (па табліцы) залікових удзельнікаў двух этапаў спаборніцтваў.

### ФЕХТАВАННЕ

Спаборніцтвы асабіста-камандныя. Састаў каманды — 3 мужчыны і жанчына. Спаборніцтвы праводзяцца па ўсіх відах зброі. Сістэма — кругавая. Каманднае першынство вызначаецца па найменшай суме ачкоў-месц (1-ае месца — 1 ачко, 2-ое — 2 ачкі і г. д.).

### МНАГАБОР'Е ГПА

Састаў каманды — 10 чалавек, незалежна ад пола, залік — па 8 лепшых выніках.

**Праграма:**

Зімой для мужчын — лыжная гонка на 10 км, падцягванне на перакладзіне, стральба на 25 м з м/к вінтоўкі; для жанчын — лыжная гонка на 3 км, згібанне і разгібанне рук ва ўпоры, стральба на 25 м з м/к вінтоўкі.

Летам для мужчын: — бег на 100 м, скачкі ў даўжыню або ў вышыню, мятанне гранаты або штурханне ядра, плаванне на 100 м, крос на 3000 м; для жанчын — тыя ж самыя віды (крос —на 1000 м).

У залік універсіяды спаборніцтвы па зімніх і летніх відах мнагабор'я ідуць асобна. Каманднае першынство вызначаецца на найменшай колькасці ачкоў-месц.

## СПОРТ СПОРТ СПОРТ



Пасля трэніроўкі. Фота А. Рудчанкі.

## ЧЭМПІЁНКА СТУДЭНЦКАГА ТАВАРЫСТВА

Днямі ў Адэсе закончылася ўсесаюзнае першынство «Буравесніка» па лёгкай атлетыцы. Вялікага поспеху ў ім дабіўся студэнцкі калектыў Беларусі, які ўпершыню ў агульнакамандным заліку заваяваў трэцяе месца, прапусціўшы наперад толькі моцныя каманды Расійскай Федэрацыі і Украіны.

Гонар нашай рэспублікі выдатна абараняла студэнтка факультэта фізічнага выхавання Гомельскага дзяржаўнага універсітэта Зінаіда Гразева. На 400-метровай дыстанцыі яна апярэдзіла ўсіх сваіх саперніц і з вынікам 56,3 секунды стала чэмпіёнкай студэнцкага таварыства краіны.

На долю здольнай гомельскай студэнткі дастаўся і яшчэ адзін залаты медаль. Зінаіда заваявала яго ў саставе беларускага квартэта спартсменак, якія атрымалі перамогу ў заключны дзень спаборніцтваў у эстафеце 4х400 метраў. Дзяўчаты паказалі вынік 3 мінуты 50 секунд.

**І. КУЛЬЧЫЦКІ.**

## *Мацнейшыя ў рэспубліцы*

Водасховішча Вяча, што пад Мінскам, на працягу двух дзён было арэнай напружанай барацьбы за асабістае і каманднае першынство рэспублікі па акадэмічнаму веславанню. З вялікім поспехам у гэтых спаборніцтвах выступілі гамяльчане, сярод якіх было большасць студэнтаў нашага ўніверсітэта. У камандным заліку яны здолелі апярэдзіць усіх сваіх супернікаў.

Бліскуча правёў гонку на блакітнай дарожцы 18-гадовы кандыдат у майстры спорту Мікалай Грамыка. Выступаючы на адзіночцы, ён здолеў апярэдзіць мінскага дынамаўца майстра спорту, пераможцу ўсесаюзных спаборніцтваў па другой групе Уладзіміра Майсейчыка, які лідзіраваў у пачатку дыстанцыі, і закончыў заезд з лепшым вынікам.

Сярод жанчын не было роўных на адзіночцы і выхаванцы ГДУ Тамары Юрковай. Яна таксама заваявала залаты медаль чэмпіёнкі рэспублікі.

Мацнейшымі былі гамяльчанкі і ў заездзе чацвёркі парнай з заграбной М. Рэвінай.

Святкавала перамогу таксама і мужчынская чацвёрка парная з заграбным Л. Камандой.

Спартыўны сезон для весляроў ужо заканчваецца. Сёлета ім застаецца толькі яшчэ раз прадэманстраваць сваё майстэрства. У канцы кастрычніка ўпершыню ў рэспубліцы намечана правесці на Сожы «Гомельскую рэгату».

**Б. ВАЛОДЗІН.**

НАШ МЕДЫЦЫНСКІ ЛЕКТОРЫЙ

## ХАРЧАВАННЕ І ЗДАРОЎЕ

**Здароўе чалавека — найвялікшая каштоўнасць. Яго трэба ўмець берагчы, загартоўваць, каб падоўжыць сваё жыццё. Як рабіць гэта, вы, паважаныя таварышы, можаце даведацца па матэрыялах нашага медыцынскага лекторыя, які адкрываем з сённяшняга нумара газеты.**

**Першым з цыклам гутарак па тэме: «Харчаванне і здароўе» выступіць кандыдат медыцынскіх навук В. П. Дзядзічкін.**

Шмат тэарэтычных і практычных ведаў атрымоўвае чалавек у жыцці. Аднак яго вельмі рэдка вучаць правільна харчавацца.

Страва з'яўляецца адзінай крыніцай энергіі і будаўнічага матэрыялу для фарміравання складаных структур арганізма. Таму перш за ўсё скажам аб тым, з якіх асноўных рэчываў пабудавана цела чалавека.

Аналіз паказвае, што ў целе дарослага, нармальна развітага чалавека вагой 70 кг утрымліваецца: вады — 40—45 кг, бялкоў — 15—17 кг, тлушчу — 7—10 кг, мінеральных солей — 2,5—3 кг, вугляводаў — 0,5—0,8 кг. Няспыннае абнаўленне чалавечага цела патрабуе правільнага і рэгулярнага ўжывання стравы. Напрыклад, за 80 дзён абнаўляецца каля палавіны ўсіх бялкоў цела чалавека.

Навуковыя назіранні пацвярджаюць, што бялкі чалавечага цела ў працэсе жыцця павінны абнавіцца ў сярэднім не менш двухсот разоў. Калі б у арганізме не адбывалася распаду, дык накапілася б столькі бялку, што яго хапіла б на будову цела двухсот чалавек.

За 70 гадоў жыцця чалавек з'ядае і выпівае (у тонах): вады — 50, бялкоў — больш 2, вугляводаў — больш 10, павaранай солі — 0,2—0,3 тоны.

Шматвекавы вопыт урачэбных назіранняў і эксперыментальныя даследаванні засведчылі, што для падтрымання здароўя чалавеку патрэбна страва строга пэўнай якасці. Нягледзячы на індывідуальныя, геаграфічныя, кліматычныя адрозненні, агульныя прынцыпы рацыянальнага харчавання захоўваюць сваю сілу.

Лічаць, што здаровы чалавек сярэдняга ўзросту расходуе ў гадзіну на адзін кілаграм вагі цела адну кілакалорыю. Значыць, мужчына вагой 70 кг патрабуе ў суткі 1700 кілакалорый, а жанчына вагой 60 кг — 1400. Любая работа патрабуе дадатковых затрат энергіі.

Для вызначэння каларыйнасці прадуктаў карыстаюцца адпаведнымі табліцамі. Для самых прыкладных разлікаў трэба мець на ўвазе, што каларыйная вартасць звычайнай порцыі (500 г) большасці супаў хістаецца ад 200 да 300 кілакалорый. Каларыйная каштоўнасць малочных крупяных супаў і зборных мясных салянак можа быць вышэй 400 кілакалорый.

Пераважная большасць мясных страў з гарнірам у сталовых грамадскага харчавання ўтрымлівае ад 500 да 600 кілакалорый, рыбных страў — каля 500 і ніжэй, гародніных — ад 200 да 400 у асноўным за кошт прыпраўленага тлушчу. Каша з малаком дае каля 350—400 кілакалорый, кампот, кісель, кава і г. д. — ад 100 да 150.

Чым выклікаецца неабходнасць займацца падлікам каларыйнасці стравы? Гэта патрэбна не толькі для аднаўлення энергіі, але і для папярэджання лішняй вагі. Прыкладныя разлікі паказваюць, што рэгулярнае пераяданне ўсяго на 200 кілакалорый у дзень павялічвае колькасць рэзервнага тлушчу на 10—20 г, што складзе за год 3,6—7,2 кг.

Як мы адзначылі, для чалавека вельмі важны якасны састаў стравы. Якія ж рэчывы неабходны арганізму?

Цела чалавека на дзве трэці пабудавана з вады. Асабліва багаты ёй тканкі маладога арганізма. К старасці колькасць вады ў арганізме змяншаецца і наша скура зморшчваецца. Без стравы чалавек можа пражыць некалькі тыдняў, без вады — усяго некалькі сутак. Сутачная патрэба чалавека ў вадзе ў сярэднім 2,3—2,7 літра. Водны баланс вызначаецца наступнымі велічынамі: вада піцявая (чай, кава) — 0,8—1 л, супы — 0,5—0,6 л, вада ў цвёрдых прадуктах — 0,7 л, вада, якая ўтвараецца ў самім арганізме — 0,3—0,4 л. Такім чынам, чалавек ва ўмовах нармальнай тэмпературы і ўмеранай фізічнай нагрузкі не павінен выпіваць за суткі больш літра вады.

**В. ДЗЯДЗІЧКІН,**
**кандыдат медыцынскіх навук.**


## ВЫПІСВАЙЦЕ І ЧЫТАЙЦЕ «УЧИТЕЛЬСКУЮ ГАЗЕТУ»

**«Учительская газета» — орган Міністэрства асветы СССР і Цэнтральнага камітэта прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў. «Учительская газета» — даўняшні сябра і дарадчык народнага настаўніка. Яна выдаецца з 1924 года і вось ўжо хутка паўстагоддзя, як выступае калектыўным арганізатарам работнікаў асветы. Заснаваная Н. К. Крупскай, газета адрасуе свае выступленні педагогам, выхавацелям, бацькам — усім, каму дарагія дзеці, каму блізкія інтарэсы выхавання падрастаючага пакалення.**

**У 1974 годзе «Учительская газета» будзе шырока асвятляць дзейнасць настаўніцтва, партыйных і прафсаюзных арганізацый асветы, органаў народнай адукацыі па выкананню гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС, пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб завяршэнні пераходу да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі і далейшым развіцці агульнаадукацыйнай школы».**

**Шмат цікавага для сябе знойдуць у газеце выкладчыкі і студэнты педагагічных навучальных устаноў, супрацоўнікі дашкольных і пазашкольных устаноў, настаўнікі вячэрніх (зменных) школ рабочай моладзі, работнікі прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў.**

**Падпісная цана:**
**На 12 месяцаў — 4 руб. 48 кап., на 6 месяцаў — 2 руб. 34., на 3 месяцы — 1 руб. 17 кап.**

**Падпіска на «Учительскую газету» на 1974 год прымаецца ў пунктах падпіскі «Саюздрук», аддзяленнямі сувязі, грамадскімі распаўсюджвальнікамі.**



Рэдактар Ул. БАЛОГА.

АЗ 34036 «Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Фармат —420×300 мм. Тыраж 2000 экз. Заказ 5549